Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 КРАСАВІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 83 (29197)

Сімвал салідарнасці працоўных

Паважаныя суайчыннікі!

Прыміце самыя сардэчныя віншаванні са Святам працы.

Першамай сімвалізуе салідарнасць працоўных, сцірае межы паміж краінамі і пакаленнямі.

Для жыхароў Беларусі стваральная праца на роднай зямлі пад мірным небам заўсёды была і застаецца найвялікшай каштоўнасцю. У нашай краіне пашаны і падзякі заслугоўваюць усе працоўныя калектывы, ветэраны працы, маладыя спецыялісты, кожны, хто робіць свой унёсак у агульнае дабро, робіць Айчыну багацейшай і прыгажэйшай.

Мы ствараем будучыню на прынцыпах сацыяльнай справядлівасці, бязмежнай павагі да неабыякавых і таленавітых прафесіяналаў, якія, не шкадуючы сіл, гатовыя вырашыць самыя складаныя задачы, што стаяць перад дзяржавай, і абараніць наш народ ад любых напасцяў.

Перакананы, разам мы справімся з усімі выклікамі часу.

Жадаю вам моцнага здароўя, згуртаванасці ў калектывах, любові ў сем'ях. Хай кожны новы дзень прыносіць радасць і выдатны вясновы настрой.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

На высокім узроўні

ЦЫТАТА ДНЯ

Эдуард ТАМІЛЬЧЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі:

«Да 2020/2021 навучальнага года ў адукацыйным працэсе будуць выкарыстоўвацца абноўленыя навучальныя праграмы і дапаможнікі па прадметах «Сусветная гісторыя», «Гісторыя Беларусі» для 10 класа, а да 2021/2022 навучальнага года — для 11 класа, у змест якіх будуць уключаны найноўшыя даследаванні гістарычнай навукі. Адным з патрабаванняў да стварэння новых навучальных дапаможнікаў з'яўляецца рэалізацыя прынцыпу навуковасці — адпаведнасць зместу вучэбнага матэрыялу ўзроўню сучаснага развіцця навукі, дакладнасць выкладання фактаў, законаў, прынцыпаў, тэорый».

У цэнтры сталіцы, на вуліцы Магілёўскай, спецыялісты прадпрыемства «Прамэкс» будуюць шматузроўневы паркінг на 240 машына-месцаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАРАТКА

- **On Air марафон «Беларусь памятае. Кветкі Вялікай Перамогі» пройдзе 5–8 мая.**
- Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту ў I квартале склаў Br0,2 млрд.
- **«Луч» выпусціў лімітаваную калекцыю гадзіннікаў да 75-годдзя Перамогі.**
- Міжнародная фармкампанія перадасць Беларусі патэнцыйна эфектыўны для лячэння COVID-19 прэпарат.

ISSN 1990 - 763X

Руплівым гаспадарам

КАЛЯРОВАЯ БУЛЬБА І АРЭХАВЫЯ САДЫ

Што вучоныя прапануюць для прысядзібных участкаў

Нарэшце мы дачакаліся сапраўднай вясны. Начныя замаразкі скончыліся, глеба прагрэлася да 8 градусаў — а гэта значыць, можна садзіць бульбу. Прычым лепш айчыннай селекцыі. Як паведаміў генеральны дырэктар РУП «Навукова-практычны цэнтр па бульбаводстве і агародніцтве» Вадзім МАХАНЬКО, попыт беларусаў на айчынныя сарты з кожным годам павялічваецца. Ва ўсякім разе, сёлета зваротаў па насенку ў магазін навукова-практычнага цэнтра было ў два разы болей, чым летась.

СТАР. 4

Непажаданыя насельнікі

Што робіцца на гарышчах і ў падвалах?

Тэхнічны паверх у шматпавярховай забудове — вельмі карысная рэч. У невялікім асабістым адсеку можна размясціць рэчы, якія нібыта не вельмі патрэбны, пры гэтым яны не загрувашчваюць прастору ўнутры кватэры. Разам з тым прадметы, якія адпраўляюцца ў «ганаровую ссылку», не заўжды захоўваюцца бяспечна для іншых. Дадаюць тут праблем і асобы без пэўнага месца жыхарства.

Пра тое, чым небяспечныя пажары ў падвалах і як часта яны здараюцца, карэспандэнт «Звязды» распытаў **афіцыйнага прадстаўніка МНС сталіцы Вольгу МЕЛЬЧАНКА.**

— Людзі без даху над галавой не вельмі любяць гарышчы. Па-першае, у дамах вельмі шмат непажаданых сведак — паспрабуйце ўвесь час хадзіць на дзявяты ці яшчэ вышэйшы паверх так, каб вас ніхто не ўбачыў. А напрыклад, у падвал класічнай «хрушчоўкі» можна зайсці проста з двара. Па-другое, яны заўсёды ідуць туды, дзе можна пераначаваць у цяпле, — праз падвал ідуць трубы ацяплення і гарачага водазабеспячэння. Бывае і так, што непажаданыя госці пранікаюць у падвал праз выбітае назіральнае акно ці ўзломваюць замок на дзвярах. Хоць бываюць розныя сітуацыі, — адзначае Вольга Мельчанка.

Сёлета сталічныя падвалы і гарышчы гарэлі ўжо адзінаццаць разоў. На першы погляд, быццам і няшмат. А калі паглядзець больш дэталёва, то такі пажар вельмі небяспечны. Класічны падвал у пяці- ці дзевяціпавярховіку (вядома, там, дзе ён ёсць) — гэта нярэдка складаная сістэма праходаў, якія могуць заканчвацца тупікамі. І кожны такі тупік павінны абследаваць пажарныя, каб упэўніцца, што там нікога няма. Пры пажары чадны газ і дым вельмі істотна памяншаюць шанцы на выратаванне.

СТАР. 3

Жыллёвая палітыка

ІПАТЭЧНАМУ КРЭДЫТАВАННЮ — ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

Беларускі ўрад прапануе ўсім банкам актыўна ўключыцца ў іпатэчнае крэдытаванне. Пра гэта днямі заявіў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір КУХАРАЎ.

У гэтым кірунку ў банкаў ніякіх абмежаванняў няма, лічыць віцэ-прэм'ер. Ён адзначыў, што папярэдне ўжо праведзеныя перамовы з усімі банкамі, тыя, у сваю чаргу, вывучаюць магчымыя падыходы. Дарэчы, фінансавыя інстытуты актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы праекта Указа «Аб іпатэчным жыллёвым крэдытаванні», і іх прапановы таксама ўлічваліся.

Уладзімір Кухараў выказаў меркаванне, што ўказ з'яўляецца вельмі важным нарматыўным дакументам, якога чакалі ўсе. «Спадзяёмся, гэты ўказ дасць больш магчымасцяў для спажыўцоў і новыя інструменты для набыцця жылля, — паведаміў ён. — Цяпер рыхтуем яшчэ адзін важны нарматыўна-прававы дакумент — гэта Указ «Аб жыллёва-будаўнічых зберажэннях». Іпатэка і жыллёвыя зберажэнні — тыя механізмы, якія, на наш погляд, дазволяць значна пашырыць магчымасці грамадзян у набыцці жылля».

Асобна спыніўся намеснік прэм'-ер-міністра на тэме стварэння дарожнай карты па рэалізацыі ўказа аб іпатэцы. Ён заявіў, што цяпер рыхтуюцца змены ў шэраг нарматыўных дакументаў, а таксама пастанова Савета Міністраў, якая рэгламентуе парадак ажыццяўлення механізмаў крэдытавання. Адпрацоўка гэтага механізму патрабуе пэўнага часу. «Чалавек павінен вывучыць усе магчымасці, банкі павінны ўсё адпрацаваць. Мы бачым, што на гэта спатрэбіцца год ці паўтара. Акрамя таго, трэба разумець: каб механізмы працавалі, павінен быць адпаведны рынак жылля. Таму, як і планавалі, мы пабудуем сёлета 4 мільёны квадратных метраў жылля», — дадаў Уладзімір Кухараў.

На яго думку, набываючы жыллё, чалавек павінен мець вялікі выбар, бо ў кожнага свае патрэбы і магчымасці. Сёння перад будаўнічым комплексам краіны ставіцца задача будаваць жыллё розных параметраў, пачынаючы ад невялікіх кватэр, якія, дарэчы, карыстаюцца вельмі вялікім попытам, да жылля з вялікім метражом, з адстройваннем або без.

МЕХАНІЗМ ЗАКЛАДУ ПРАЦУЕ Ў БЕЛАРУСБАНКУ БОЛЬШ ЗА ДВА ГАДЫ

Начальнік аддзела камунікацый упраўлення інфармацыі і сацыяльнага развіцця Беларусбанка Аляксей КУЛІК лічыць, што Указ № 130 накіраваны на павышэнне даступнасці для грамадзян крэдытаў на фінансаванне нерухомасці, а таксама пашырае практыку выкарыстання іпатэкі ў якасці асноўнага спосабу забеспячэння па крэдытах на куплю жылля. «І гэта, безумоўна, добрыя навіны для крэдытаатрымальнікаў, таму што ў цяперашніх умовах няпроста знайсці паручыцеля», — лічыць прэс-сакратар банка.

Ён таксама заўважыў, што да цяперашняга часу ў большасці выпадкаў іпатэка выкарыстоўвалася банкамі як дадатковае забеспячэнне па крэдытах, у адрозненне, напрыклад, ад таго ж паручыцельства. У гэтай сувязі новыя падыходы, якія замацоўваюцца ўказам, больш лаяльныя ў адносінах да фізічных асоб — паручыцеляў: у першачарговым парадку спагнанне будзе звяртацца банкамі на прадмет іпатэкі. Толькі ў выпадку немагчымасці такога спагнання банк звернецца да паручыцеляў.

Акрамя таго, дакумент аб іпатэцы выразна фармалізуе падставы звароту банкаў па спагнанне на прадмет іпатэкі: пратэрміноўка па крэдыце павінна перавышаць 90 дзён, а памер запазычанасці па крэдыце — 10 % ад сумы крэдытнай запазычанасці. Акрамя таго, паколькі цяпер заклад (іпатэка) узнікае ў сілу заканадаўства і не патрабуецца заключэнне дагавора аб закладзе, то бакі паводле крэдытнага дагавора не будуць несці дадатковых выдаткаў, звязаных з натарыяльным пасведчаннем і дзяржаўнай рэгістрацыяй дагавораў закладу.

Беларусбанк гатовы да новаўвядзенняў, бо заклад па крэдытах на нерухомасць ўжо больш за два гады прымяняецца банкам досыць актыўна, што памяншае і колькасць паручыцеляў, і іх ролю ў забеспячэнні па крэдытнай здзелцы.

Цяпер па крэдытах на куплю нерухомасці банк разглядае магчымасць выдачы крэдытаў толькі пад заклад набытага жылля, пры гэтым паручыцельства фізічных асоб выступае забеспячэннем па крэдыце толькі да моманту заключэння дагавора аб закладзе (іпатэцы).

Сяргей КУРКАЧ.

Будзьце ў курсе

З 1 МАЯ — НОВЫ БПМ

З 1 мая нас чакаюць новыя памеры бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, а таксама па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах. Дзейнічаць яны будуць да 31 ліпеня 2020 года.

Як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва будзе ўстаноўлены ў памеры 246 рублёў 78 капеек. Гэта на 2,9 % вышэй у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў з 1 лютага да 30 красавіка гэтага года.

Змяніліся і памеры бюджэту пражытачнага мінімуму па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах (у цэнах сакавіка 2020 года).

У прыватнасці, яны будуць роўныя:

для працаздольнага насельніцтва — 275 рублёў 48 капеек;

для пенсіянераў — 187 рублёў 22 капейкі;

для студэнтаў — 237 рублёў 30 капеек;

для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 158 рублёў 94 капейкі;

для дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 217 рублёў 84 капейкі;

для дзяцей ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў — 265 рублёў 20 капеек.

У сувязі са змяненнем БПМ з 1 мая будуць перагледжаны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічваюцца ад памеру БПМ.

Гэта датычыцца памераў дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей; сацыяльных пенсій; даплат пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і больш; дапамог па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту; надбавак і павышэнняў да пенсій, якія прадугледжаны для асобных катэгорый пенсіянераў. Усе гэтыя выплаты павялічацца суразмерна росту БПМ — на 2,9 працэнта.

Святлана БУСЬКО.

Блізкая ўлада

Па заўсёдным графіку

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 2 мая, з 9.00 да 12.00 правядуць:

*намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

* намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

* намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

* кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

* намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

* намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

* намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Организация:

ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс»

Учетный номер плательщика: 100599687
Вид экономической деятельности: Логистические услуги
Организационно-правовая форма: Общество с дополнительной ответственностью
Орган управления: Единственный участник
Единица измерения: тысячи рублей
Адрес: 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 21Б, пом. 1, комн. 3

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2019 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2019 года	На 31 декабря 2018 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	23 180	16 608
Нематериальные активы	120	34	36
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	481
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	995
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**23 214**	**18 120**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	235	382
в том числе:			
материалы	211	235	382
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	-	-
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	134	201
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	1 421	299
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	19 442	23 936
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	347
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	1	13
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**21 233**	**25 178**
БАЛАНС	**300**	**44 447**	**43 298**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2019 года	На 31 декабря 2018 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	280	280
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	(1)
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	11 166	12 146
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	(945)	(2 165)
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**10 501**	**10 260**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	10 903	17 862
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	6 116	763
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**17 019**	**18 625**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	8 706	9 189
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	1 456	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	6 765	5 224
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	1 322	1 279
по авансам полученным	632	20	26
по налогам и сборам	633	1 888	1 836
по социальному страхованию и обеспечению	634	289	220
по оплате труда	635	656	570
по лизинговым платежам	636	2 431	364
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	159	929
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**16 927**	**14 413**
БАЛАНС	**700**	**44 447**	**43 298**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2019 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2019 года	За январь–декабрь 2018 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	46 191	40 633
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(30 560)	(27 653)
Валовая прибыль	030	15 631	12 980
Управленческие расходы	040	(10 513)	(9 179)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	5 118	3 801
Прочие доходы по текущей деятельности	070	10 065	2 921
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(12 900)	(3 194)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	2 283	3 528
Доходы по инвестиционной деятельности	100	1 346	295
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	1 107	131
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	-	3
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	239	161
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(225)	(75)
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(74)	(20)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(151)	(55)
Доходы по финансовой деятельности	120	3 146	1 177
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	3 140	1 171
прочие доходы по финансовой деятельности	122	6	6
Расходы по финансовой деятельности	130	(5 341)	(4 545)
в том числе:			
проценты к уплате	131	(2 023)	(2 022)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(2 803)	(2 467)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(515)	(56)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	140	(1 074)	(3 148)
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	1 209	380
Налог на прибыль	160	(667)	(180)
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток)	210	542	200
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	(849)	1 003
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток)	240	(307)	1 203
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель О.М. Маргун

Главный бухгалтер О.В. Будай

19 марта 2020 г.

Непажаданыя насельнікі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дадайце да гэтага рэчы, якія добра гараць або плавяцца: старую бытавую тэхніку, мэблю ці іншыя побытавыя прадметы. У нашых падвалах можна знайсці што заўгодна — аўтар гэтых радкоў, напрыклад, назіраў некалькі гадоў таму, як на падыходзе да камор жыхароў на стосе газет красаваўся стары савецкі тэлевізар, і гэта пры тым, што аналагавага вяшчання ў нашай краіне тады ўжо не існавала. А напрыклад, у адным з дамоў па вуліцы Народнай падчас рэйду ратавальнікі знайшлі ў падвале ёмістасць з палівам.

Прычына большасці пажараў у падвалах простая — залез туды чалавек без пэўнага месца жыхарства, вырашыў пераначаваць. Перад сном — крыху пакурыць. Недапалак выпадае з аслабелай рукі, і матрац пачынае тлець... Урон ад пажару адчуюць на сабе і жыхары дома, у першую чаргу тыя, хто жыве на ніжніх паверхах: яны будуць першыя, да каго гэты дым прыйдзе і закурыць кватэру. Часам ратавальнікі ў такіх сітуацыях эвакуіруюць нават тых, хто жыве на чацвёртым—пятым паверхах. Перакінуцца ў кватэру агонь звычайна не паспявае — усё ж у падвале ад дэфіцыту кіслароду больш утвараецца чаднага газу, чым полымя. Але «ўляцець» на пазачарговы рамонт можна вельмі і вельмі лёгка, бо жыць у закуранай кватэры — задавальненне вельмі адноснае.

— Раніцай 12 лютага ратавальнікі выехалі тушыць пажар у шматпавярховік на вуліцы Ротмістрава, дзе на лесвічнай пляцоўцы тэхнічнага паверха гарэў матрац. А напрыклад, 24 лютага загарэўся яшчэ адзін матрац, але ўжо ў пяціпавярховіку на завулку Вышалескага. Там гэта адбылося ў падвале і... якраз адтуль ратавальнікі выцягнулі чалавека, які быў шпіталізаваны з атручэннем прадуктамі гарэння. У назіральным акне, якое выходзіла на процілеглы бок, было выбіта шкло. Ды і ў самім падвале сляды паказвалі на тое, што там яўна жывуць людзі.

Дзеля прафілактыкі такіх пажараў ратавальнікі разам з прадстаўнікамі іншых органаў перыядычна праводзяць праверкі. Іх галоўная мэта — дамагчыся таго, каб уваходы ў падвал для пабочных асоб былі надзейна перакрыты.

— Нейкіх нарматываў, якія рэгламентавалі б частату такіх рэйдаў, няма. Часцей за ўсё іх неабходнасць вызначаецца разам з мясцовым выканаўчым камітэтам у залежнасці ад той абстаноўкі, якая складваецца. Як правіла, гэта падрыхтоўка або да ацяпляльнага сезону, або да вясенне-летняга часу. Напрыклад, сёлета ў планах да 30 красавіка — камісійнае абследаванне ўсіх падвальна-тэхнічных памяшканняў і гарышчаў усіх шматкватэрных дамоў на прадмет іх належнага стану. У складзе камісій — прадстаўнікі не толькі МНС, але і ЖКГ, адміністрацый раёнаў Мінска, таварыствы ўласнікаў.

Сёлета камісіі праінспектавалі ў Мінску больш за чатыры з паловай тысячы шматпавярховікаў. Парушэнні знайшліся ў 337. Чаго ж яны датычыліся?

— Праходы ў падвале былі застаўлены буйнагабарытным смеццем, і знаходзіліся невядома чые лыжанкі. Даволі часта мы сутыкаемся з сітуацыяй, калі ёсць вольны доступ у тэхнічнае падполле — маецца на ўвазе вольны доступ у тыя падвалы, дзе камор не існуе ў прынцыпе. Хоць туды звычайныя людзі не маюць права заходзіць. Таму камунальнікі і таварыствы ўласнікаў павінны сачыць за тым, каб дзверы былі зачынены, а замкі былі спраўныя. Ці робяць гэта заўжды? Не.

...На жаль, сітуацыя з распаўсюджваннем каранавіруса ўнесла свае змены і ў рэйды. Канешне, было б вельмі нядрэнна пахадзіць разам з інспектарамі па падвалах, але давядзецца адкласці гэта да лепшых часоў. Таму мы запыталіся ў **старшага інспектара Кастрычніцкага РАНС Ірыны СВІРЫД,** ці з'яўляюцца парушэнні масавымі.

— Мы праверылі ў адзін дзень шматпавярховікі па вуліцы Магілёўскай у Мінску. І — што адметна — у кожным будынку свая асаблівасць. Напрыклад, у адным з дамоў мясцовы жыхар вынес на лесвічную клетку разабраны ложак, табурэткі і камоду. Праўда, растлумачыў ён гэта тым, што ў кватэры ідзе рамонт, а ў аднапакаёўцы кудысьці пераставіць мэблю складана. І ў гэты ж дзень усё прыбраў. У другім доме не выявілі ўвогуле ніякіх парушэнняў — усе дзверы ў падвал зачынены. А вось у трэцім іх не замкнулі. Не было ніякіх прыкмет і навяснога замка. Узнікла пытанне — можа, там пасяліліся бяздомныя? Але нікога не аказалася, зрэшты, як і рэчаў. У гэты ж дзень камунальнікі павесілі на дзверы падвала замок.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота дадзена Кастрычніцкім РАНС Мінска.

ХТО МОЖА ЛЯЧЫЦЦА ДОМА

З сярэдзіны красавіка, згодна з адпаведным загадам Міністэрства аховы здароўя, пацыенты з лёгкім цячэннем COVID-19 і няцяжкімі пнеўманіямі лечацца дома. Медыкі распрацавалі памятку для пацыентаў, у якіх каранавірусная інфекцыя працякае ў лёгкай і бессімптомнай формах.

Рашэнне аб лячэнні дома прымае ўрач. Пры гэтым ён ацэньвае і ўлічвае ўзрост і стан хворага, паказчыкі здароўя, дыягнастычныя даследаванні і спадарожныя хваробы. Таксама маюць значэнне жыллёвыя ўмовы, магчымасць забеспячэння прадуктамі, сродкамі сувязі і іншае.

Дома могуць знаходзіцца толькі пацыенты з лёгкім ці бессімптомным цячэннем хваробы, яны павінны быць маладзейшыя за 55 гадоў, не мець хранічных захворванняў, у прыватнасці цукровага дыябету, хранічнай сардэчнай недастатковасці, бранхіяльнай астмы. Акрамя таго, ім трэба мець магчымасць абслугоўваць сябе самастойна ці з дапамогай блізкіх, жыць у ізаляваным пакоі. У сельскай мясцовасці прымаецца да ўвагі рэальны час прыбыцця брыгады хуткай дапамогі.

Калі ўрач прыняў рашэнне, што можна лячыцца дома, пацыенту прапануюць падпісаць інфармаваную згоду. Прызначаецца лячэнне, якое трэба няўхільна выконваць.

Пры гэтым пацыенту кожны дзень тэлефануе медыцынскі работнік. Некалькі разоў падчас бальнічнага яго наведвае ўрач. Пры гэтым медыцынскія работнікі адзеты ў ахоўнае спецадзенне і просяць паставіцца да гэтага з разуменнем.

Надвор'е

На майскія святы — халаднавата

Да канца гэтага тыдня ў нас чакаецца няўстойлівае надвор'е з ваганнямі тэмпературнага рэжыму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А вось у нядзелю пацяплее да плюс 20—23 градусаў

У першы дзень мая будзе ў асноўным без ападкаў, толькі ўначы і раніцай па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, месцамі — да плюс 5—8 градусаў. Удзень будзе 11—18 цяпла.

А вось з другога майскага дня ў краіне пачнецца сапраўды вясновае надвор'е. У суботу і нядзелю да нас занясе атмасферныя франты і больш цёплыя паветраныя масы з Заходняй Еўропы. Чакаецца няўстойлівае, але мяккае надвор'е з дажджамі. У суботу ўначы па захадзе, раніцай і ўдзень у многіх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 9 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 11 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе плюс 14—19 градусаў, у паўднёва-ўсходніх раёнах — 20—23 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 да плюс 11 градусаў. Удзень будзе 13—20 цяпла, а па паўднёвым усходзе нават да плюс 21—24 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Covid-статыстыка

На 29 красавіка ў Беларусі выяўлены 13 181 выпадак COVID-19, 2072 пацыенты з раней пацверджаным дыягназам паправіліся і выпісаны, 84 чалавекі з хранічнымі захворваннямі і выяўленай каранавіруснай інфекцыяй памерлі. За апошнія суткі колькасць інфіцыраваных вырасла на 973.

З канца лютага ў Беларусі праведзена 168 986 тэстаў. Колькасць захварэлых складае 7,8 % ад усіх пратэсціраваных.

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Войскі патрулююць вуліцы Бейрута пасля разгону дэманстрантаў

Патрулі ліванскай арміі аднавілі кантроль над асноўнымі вуліцамі Бейрута, выцесніўшы з іх актывістаў пратэстнага руху. Новая хваля пратэстаў у краіне выклікана больш чым двухразовым абясцэньваннем нацыянальнай валюты — ліванскага фунта, якое пацягнула за сабой падаражэнне прадуктаў харчавання амаль на 60 працэнтаў. Дэманстранты патрабуюць ад улад абароны іх сацыяльных правоў і кампенсацыі за страты, панесеныя з-за прынятых урадам у сакавіку надзвычайных мер па барацьбе з новым каранавірусам. Акрамя сталіцы, ачагамі хваляванняў сталі гарады Трыпалі і Сайда. Прэм'ер-міністр Хасан Дзіаб заявіў, што гэтай небяспечнай гульні з агнём будзе пакладзены канец.

Усіх жыхароў Люксембурга праверацьна каранавірус

Улады Люксембурга плануюць за месяц правесці праверку ўсяго насельніцтва на прадмет заражэння каранавірусам, паведамляе выданне L'essentiel. Тэсціраванне мяркуецца праводзіць з 19 мая. Акрамя таго, урад хоча праверыць усіх рэзідэнтаў і жыхароў пагранічных раёнаў, якія працуюць на супрацьлеглым баку граніцы і штодня яе перасякаюць. Як заявіла міністр аховы здароўя краіны Полет Ленерт, «мы зможам такім чынам ізаляваць інфіцыраваных людзей. Гэта найлепшы спосаб спыніць распаўсюджванне віруса». Паводле слоў міністра вышэйшай адукацыі і навукі Клода Мейша, міністэрства ўжо закупіла 600 тысяч тэстаў на суму 40 мільёнаў еўра.

У Борыса Джонсана нарадзіўся сын

У прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Борыса Джонсана і яго нявесты Кэры Сімандс 29 красавіка нарадзіўся сын. Пра гэта паведаміла «Бі-бі-сі». Па словах прэс-сакратара прэм'ера, маці і дзіця адчуваюць сябе добра. Джонсану 55 гадоў. Нованароджаны стаў яго шостым дзіцем. Мяркуецца, што прэм'ер ажэніцца з нявестай, як толькі завершыцца яго шлюбаразводны працэс. Сімандс стала першай за апошнія 250 гадоў партнёркай брытанскага прэм'ер-міністра, якая не знаходзіцца з ім у афіцыйным шлюбе. Незадоўга да нараджэння сына Джонсан выпісаўся са шпіталя, дзе лячыўся ад каранавіруснай інфекцыі.

ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»
(220108, г. Минск, ул. Казинца, 121А, комн. 327, тел. 8 (017) 398-20-40, www.integral.by)
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОДАЖЕ Б/У ОБОРУДОВАНИЯ:

Наименование	Стоимость с учетом НДС, бел. руб.
1. Пресс-ножницы комбинированные НВ5222Б01, б/у, 1990 г. вып., инв. № 02255	2 496,00
2. Станок токарно-винторезный ИЖ-1И611П, б/у, 1976 г. вып., инв. № 56367	2 616,00
3. Станок вертикальный 6Т-13-1, б/у, 1988 г. вып., инв. № 93303	6 936,00
4. Универсальный фрезерный станок 6Т-80, б/у, 1989 г. вып., инв. № 96428	2 196,00
5. Токарно-револьверный станок УТ16ПМ, б/у, 1987 г. вып., инв. № 88925	4 068,00
6. Пресс И1020, б/у 1990 г. вып., инв. № 01449	3 120,00
7. Вертикально-фрезерный станок ВМ-127, б/у, 1982 г. вып., инв. № 67237	9 516,00
8. Вертикально-сверлильный станок 2Н125Л, б/у, 1983 г. вып., инв. № 68801	1 236,00

Указанная стоимость действует до 25.05.2020 г., условия оплаты – предоплата 100 % стоимости оборудования.
Полный перечень оборудования, подлежащего отчуждению путем прямой продажи, размещен на сайте www.integral.by (раздел «О КОМПАНИИ/Реализация б/у оборудования»).
Контактные лица: Сак Ольга Валерьяновна, тел.: 8 (029) 751-10-00, 8 (017) 398-65-47, e-mail: osak@integral.by.
УНП 100386629

КАЛЯРОВАЯ БУЛЬБА І АРЭХАВЫЯ САДЫ

Беларуская сыравіна для чыпсаў

Вучоныя Акадэміі навук упэўнены, што развіццё айчыннага садаводства і агародніцтва — гарантыя харчовай бяспекі. «Наш навукова-практычны цэнтр закрывае ўсе асноўныя патрэбы і па сельгаскультурах, і па сартавым наборы, — заўважае Вадзім Леанідавіч. — А паглядзіце, што з-за эпідэміі адбываецца на сусветных рынках. Гандлёвыя сувязі парушаюцца. Мы чуем скаргі ад замежных калег, што ім не паставілі гарантаваныя аб'ёмы насення».

Беларускія сарты бульбы прывабліваюць стабільнасцю і ўласцівасцямі, да якіх прызвычаіліся спажыўцы. Асартымент з кожным годам пашыраецца. Улічваючы, што прысядзібныя гаспадаркі імкнуцца вырошчваць экалагічна чыстую прадукцыю, вучоныя вядуць селекцыю менавіта ў гэтым кірунку: ствараюць сарты ранняга тэрміну выспявання і з павышанай устойлівасцю да хвароб. Раннія паспяваюць даць ураджай да таго, як раслін «накрыюць» фітафтора і іншыя праблемы.

Наогул селекцыя бульбы ў Беларусі вядзецца ўжо каля 100 гадоў. Інстытут можа прапанаваць прадукцыю для самых розных патрэб. Адзін з традыцыйных кірункаў — вытворчасць высокакрухмальных сартоў. Развіваецца перапрацоўка, запускаюцца новыя заводы (напрыклад, па вырабе сухога пюрэ) — адпаведна, расце попыт на раслінную сыравіну. Ужо сёння мы здольныя закрыць патрэбы ў сартах, якія падыходзяць для перапрацоўкі на чыпсы і сухое пюрэ, а ў найбліжэйшы час — і для бульбы-фры.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Агароднікаў прыемна ўразілі ранніе і ультраранніе сарты, распрацаваныя беларускімі вучонымі. За два-тры гады заваяваў папулярнасць Палац, уключаны ў рэестр ультраранні Першацвет. Можна падабраць прадукцыю на любы густ — клубні розныя па форме (круглыя, авальныя), з пэўнай афарбоўкай лупіны і мякаці. Праз пару гадоў вучоныя спадзяюцца парадаваць дачнікаў новымі сартамі — фіялетавымі і ружовымі ўнутры. Сёлета адзін з такіх каляровых

сартоў аддаецца на дзяржвыпрабаванне.

Новы прадукт наўрад ці заменіць традыцыйную бульбу, але можа парадаваць сваімі якасцямі амататараў. Некаторыя ўзоры з фіялетавай мякаццю захоўваюць афарбоўку ў працэсе варкі, смажання, прыгатавання чыпсаў.

Каляровая бульба — гэта не вынаходніцтва чалавека. Яна сустракаецца ў прыродзе. Вучоныя толькі пастараліся яе размножыць і зрабіць больш устойлівай для вырошчвання ў пэўных кліматычных умовах. Экзатычная бульба вылучаецца павышаным утрыманнем антыаксідантаў (у дзесяць разоў вышэйшым, чым у звыклых нам караняплодах).

Дзьмухаўцы падкажуць

Загадваць, які будзе ўраджай бульбы, пакуль яшчэ рана. Цёплая зіма прыйшлася даспадобы каларадскаму жуку, але гэтая праблема лёгка вырашаецца: ёсць хімічныя і біялагічныя прэпараты для барацьбы са шкоднікам.

Куды больш трэба хвалявацца за якасць насення. Зімой не было маразоў, некаторыя гаспадаркі не змаглі да канца ахаладзіць сховішчы, што адбілася на захаванасці бульбы. Усё ж караняплод нават у час спакою «дыхае». Унутры клубня адбываюцца пэўныя біяхімічныя працэсы, якія пры нізкіх тэмпературах (а для захоўвання аптымальны рэжым плюс 2—3 градусы) запавольваюцца.

Натуральна, калі бульба раней часу пачала прарастаць у вашых сховішчах, зацягваць з пасадкай не трэба. Каляндарных тэрмінаў для высадкі «другога хлеба» не існуе, важна ўлічваць біялогію культуры. Глеба павінна прагрэцца да васьмі градусаў, калі ж садзіць бульбу ў халодную зямлю, яна можа быць пашкоджана хваробамі. Звяртайце ўвагу на народныя прыкметы: пачынаюць распускацца лісцікі на бярозе і красаваць дзьмухаўцы — самы час заняцца бульбай. Калі хочаце атрымаць добры ўраджай, не забывайцеся пра якасны пасадачны матэрыял. Нават калі вам падабаецца пэўны сорт, раз на тры гады вучоныя рэкамендуюць яго абнаўляць, набываць элітнае насенне.

Лежабока ў агародзе

Як паведаміў **дырэктар Інстытута агародніцтва Андрэй ЧАЙКОЎСКІ**, на 2020 год у дзяржрэестр уключаны 115 сартоў і 31 гібрыд па 40 агародных культурах, якія могуць вырошчвацца аматарамі.

Вучоныя займаюцца не толькі звыклымі для нас буракамі, морквай ці цыбуляй, але і малараспаўсюджанымі фізалісам сунічным, вострым перцам, пастарнакам і шматгадовай цыбуляй. Вучоныя выводзяць новыя сарты, заняты вытворчасцю і размнажэннем насення, інстытут мае ўласны інтэрнэт-магазін, і падчас пандэміі каранавіруса агароднікі могуць заказваць дастаўку праз «Белпошту».

Варта звярнуць увагу на створаныя беларускімі вучонымі перцы і памідоры, тым больш што сярод іх ёсць і буйнаплодныя сарты. «Замежнікі», не адаптаваныя пад нашы кліматычныя ўмовы, могуць проста ў нас не выспець.

«Народжаны» ў інстытуце гібрыд тамата Лежабока для плёначных цяпліц трэба фарміраваць у адно сцябло — ён можа вырастаць да двух метраў. Ураджайнасць — 14-16 кілаграмаў з квадратнага метра. Па смакавых якасцях не саступае традыцыйным сартам, да таго ж плады характарызуюцца павышанай лёжкасцю. Калі ў спякоту таматы могуць хутка пераспяваць, растрэсквацца, то на Лежабоку ўраджай будзе вісець да двух тыдняў і захоўваць свой таварны выгляд.

У інстытуце стварылі сем сартоў часнаку (адзін яравой формы і шэсць азімай). Ёсць сярод напрацовак і сорт, які не стралкуецца. Беларусь магла бы цалкам насычаць рынак уласным часнаком, але тут не абысціся без дзяржрэгулявання — айчынным вытворцам вельмі цяжка канкурыраваць з кітайцамі, якія могуць дыктаваць цэны на гэту агародніну. Так, у 2010—2012 гадах нашы гаспадаркі пашыралі плошчы, маглі дасягнуць вытворчасці 200 тон, але калі імпартныя цэны былі зніжаны і з-за мяжы стаў паступаць кітайскі танны часнок, беларусы панеслі сур'ёзныя выдаткі. І тым не менш работа па стварэнні ўласных сартоў гэтай культуры працягваецца.

Фітамода

Актынідыя, хенамелес, бружмель перастаюць быць экзотыкай у садах аматараў. Нікога ўжо не здзівіш абрыкосамі, многія маюць вопыт вырошчвання персікаў. А значыць, беларускім вучоным трэба падстройвацца пад такую фітамоду. У апошнія пяць гадоў перададзены на сортавыпрабаванні тры сарты абрыкоса Дэбют, Камея, Лявон, а сёлета плануецца перадаць яшчэ і персік айчыннай селекцыі.

Дырэктар Інстытута пладаводства Аляксандр ТАРАНАЎ расказаў, што вучоныя правялі работу па насычэнні асартыменту яблынь ранняга выспявання (адна з навінак — сорт Ранак) і паспяхова справіліся з задачай па стварэнні груш позняга тэрміну выспявання: так, плады Завеі могуць ляжаць да зімы. Раянаваны замежны сорт Талгарская прыгажуня.

Асаблівую ўвагу вучоныя ўдзяляюць стварэнню раслін, устойлівых да хвароб. Здавалася б, такая культура, як вішня, не баіцца маразоў, але ёй цяжка перажыць зіму, калі яе аслабяць хваробы. Хочаце атрымаць здаровы сад — аддавайце перавагу айчынным сартам. Напрыклад, вішня Нясвіжская не баіцца такіх захворванняў, як какамікоз і маніяльны апёк.

Акрамя селекцыйных напрацовак, вучоныя вядуць работу па ўдасканаленні тэхналогій вытворчасці, распрацоўваюцца і вывучаюцца розныя сортападвойныя камбінацыі. Так, цяпер актуальнай праблемай з'яўляецца вызначэнне падвояў для абрыкоса і для персіка.

Калекцыя вінаграду Інстытута пладаводства ўражвае, тут больш за паўтысячы сартоў. Вядзецца работа па стварэнні культур з карацейшым вегетацыйным перыядам, што дазваляе атрымаць ураджай у нашых умовах.

Дзякуючы намаганням беларускіх вучоных Беларусь можа стаць арэхавай краінай. У інстытуце створаны чатыры сарты грэцкіх арэхаў. Асобныя фермеры ў Брэсцкай вобласці ўжо спрабуюць закладваць прамысловыя насаджэнні.

Даследчыкі сочаць за паводзінамі ў нашым клімаце замежных фундукоў — асобныя сарты ўжо ўключаны ў дзяржрэестр. Створаны два сарты фундуку айчыннай селекцыі для прысядзібнага вырошчвання. А ў Маладзечанскім раёне закладзены арэхавы сад плошчай каля 40 гектараў.

Управа на шкоднікаў

Нашы вучоныя займаюцца і распрацоўкай экалагічна бяспечных тэхналогій абароны ўсіх сельскагаспадарчых і пладовых культур, ствараюць як хімічныя, так і біялагічныя прэпараты. Пры Інстытуце аховы раслін працуе лабараторыя мікрабіялагічнага метаду абароны ад шкоднікаў.

Сёння многіх садаводаў-аматараў хвалюе пытанне, ці не павялічыцца колькасць праблем з садам пасля цёплай зімы і камфортнага для размнажэння шкоднікаў сакавіка. «У прыродзе ўсё заканамерна, — супакоіла **загадчык лабараторыі абароны пладовых культур РУП «Інстытут абароны раслін» Вераніка КАМАРДЗІНА.** — Нашы назіранні паказваюць, што некаторыя шкоднікі нежыццядзейныя. Было добра не толькі гэтым насякомым, але і іх ворагам. Мяркую, што вялікіх стрэсаў мы не адчуем».

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ДОМАШНИЙ ИНТЕРНЕТ ДЛЯ ЖИТЕЛЕЙ ЗАГОРОДНЫХ ДОМОВ И ДАЧ: РЕШЕНИЯ МТС

Пользоваться домашним интернетом там, где проводная сеть недоступна, позволяют услуги МТС «Интернет для дома» и «Интернет для дома Макс». Предложения разработаны для жителей частных домов, владельцев дач и фрилансеров, работающих за городом.



ООО «Мобильные ТелеСистемы» УНП 800013732

Услуга **«Интернет для дома»** включает 100 ГБ трафика в месяц на неограниченной скорости. После превышения этого объема до конца месяца можно пользоваться трафиком на скорости до 1 Мбит/с.

В услуге **«Интернет для дома Макс»** без лимита по скорости можно расходовать первые 500 ГБ трафика в месяц. После превышения этого объема интернет будет доступен до конца месяца на скорости до 2 Мбит/с.

В обе услуги без дополнительной платы включено более 90 каналов МТС ТВ и лицензионный антивирус Dr.Web для персональных компьютеров и смартфонов.

Пакетные предложения можно дополнить комплектом специального оборудования для более устойчивого приема сигнала. На территориях, удаленных от базовых станций, а также с высокой плотностью застройки, лучше использовать Wi-Fi-роутер, дополненный внешней антенной, которая позволяет усилить 3G/4G-сигнал в местах неуверенного приема сети. Стоимость Wi-Fi-роутера с внешней антенной — 50 рублей. Специалисты МТС приедут в любой регион Беларуси и бесплатно настроят оборудование, направив антенну на ближайшую базовую станцию МТС.

Если коннекту ничего не мешает — пользователи могут приобрести только Wi-Fi-роутер без внешней антенны. Стоимость данного предложения — 30 рублей.

Карту покрытия по 3G и 4G можно уточнить на сайте компании.

Подробнее об услугах смотрите на сайте компании.

«БЕЛАРУСКАМУ ВАКЗАЛУ» — 50

«Беларусь 3» 10 мая прапануе прыхільнікам класікі кінастужку «Беларускі вакзал» рэжысёра Андрэя Смірнова, якая ўбачыла свет у 1970 годзе.

Гэта гісторыя сяброў, што развіталіся на вакзале летам 1945 года, а потым зноў сустрэліся праз чвэрць стагоддзя на пахаванні баявога сябра. Дырэктар завода (былы камандзір роты) Харламаў, слесар Прыходзька (франтавы разведчык), бухгалтар Дубінскі (у мінулым — радыст) і журналіст Кірушын (які быў сапёрам) — усе яны згадаюць ваеннае мінулае і франтавое сяброўства і праявяць сябе ў новых абставінах, застаючыся адданымі і прагнымі да жыцця...

Фільм быў удастоены Галоўнай прэміі на I Фестывалі сучаснай кінематаграфіі ў Карлавых Варах у 1971 годзе. Першапачатковы сцэнарый быў напісаны Вадзімам Труніным у 1966 годзе і адрозніваўся ад знятай кінастужкі. Першым на яго звярнуў увагу рэжысёр Марк Асеп'ян, якога крануў і зацікавіў эпізод сутыкнення ў рэстаране прадстаўнікоў розных пакаленняў, што ў выніку стала для рэжысёра штуршком выпусціць у 1968 годзе праблемны фільм пра моладзь 1960-х пад назвай «Тры дні Віктара Чарнышова». А за здымкі «Беларускага вакзала» ўзяўся Андрэй Смірноў. У карціне паказаны кантраст узаемаадносін франтавікоў і маладога пакалення. У фінале фільма гучыць песня «Нам нужна одна победа», якая была напісана спецыяльна для «Беларускага вакзала». Гэтая кампазіцыя пра дэсантны батальён стала «прапускным білетам» кінастужкі да гледача: паказ хацелі забараніць, убачыўшы ў карціне дыскрэдытацыю савецкай міліцыі, але песня вельмі спадабалася ўладам, і фільм дазволілі.

Не прапусціце кіно 10 мая на «Беларусь 3».

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 93

Наступную задачу ***(гл. дыяграму)*** склалі для нашых чытачоў майстар спорту Мікалай Бельчыкаў з Барысава і Мікалай Быкаў з Баранавіцкага раёна (сёлета іх дуэт адзначае 50-годдзе сумеснай творчай дзейнасці).

Белыя: Крa8, Фa4, Кf8, Кh5, пf7 (5).

Чорныя: Крh8, Лe7, пп. a3, b4, h6 (5).

Мат за 3 хады.

У пачатковай пазіцыі ёсць два варыянты з шахамі беламу каралю: 1... Ла7+ 2. Ф:a7 і 3. Фd4х, 1... Лe8+ 2. Ф:e8 і 3. Фe5х. У рашэнні пасля першага ходу на тыя ж шахі другія хады белых змяняюцца. Прапануем чытачам самім знайсці варыянты рашэння.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У гэтай пазіцыі з партыі чорныя пагражаюць матам на h2, але чарга ходу за белымі, таму яны праводзяць пераможную камбінацыю. Паспрабуйце яе знайсці.

Белыя: Крh1, Фa3, Лd1, Лe1, Кd6, пп. a2, b2, h3 (8).

Чорныя: Крg8, Фf4, Лc2, Сg7, пп. a5, b6, f7, g5, h6 (9).

* * *

Прапануем для самастойнага аналізу дзве пераможныя партыі беларускіх шахматыстаў. Першая была згуляна летась на Сусветнай юнацкай алімпіядзе, другая — на чэмпіянаце Еўропы.

Лачазар Колеў — Аляксандра Тарасенка. 1. e4 e6 2. Kf3 d5 3. Kc3 d4 4. Ke2 c5 5. c3 Kc6 6. cd Kf6 7. Kg3 cd 8. d3 Cd6 9. Ce2 0-0 10. 0-0 h6 11. Ke1 e5 12. f4 ef 13. C:f4 C:f4 14. Л:f4 Фd6 15. Фd2 Ke5 16. Kc2 Kg6 17. Лf2 Kg4 18. C:g4 C:g4 19. Лaf1 Лac8 20. Ka3 Ke5 21. h3 Cd7 22. Ke2 Фg6 23. Крh1 Лfd8 24. Kf4 Фg3 25. Kc4 K:c4 26. dc Ce8 27. b3 Лc6 28. Kd5 Лe6 29. Ф:d4 Крh8 30. Ф:a7 Cc6 31. Фd4 f6 32. b4 Лe5 33. b5 Ce8 34. Лf3 Фg6 35. Фb6 Лc8 36. Ф:b7 Л:c4 37. Ke7 Фf7 38. Kg6+ Ф:g6 39. b6 Лc2 40. Л3f2 Л:f2 41. Л:f2 Фg3 42. Лc2 Лb5 43. Фa8 Лb1+, 0:1.

Уладзіслаў Кавалёў — Аляксандр Інджыч. 1. e4 c5 2. Kc3 a6 3. Kf3 d6 4. d4 cd 5. K:d4 Kf6 6. h3 e6 7. g4 h6 8. Cg2 g5 9. Kde2 Kc6 10. f4 Лg8 11. Лf1 Kd7 12. Ce3 gf 13. K:f4 Kce5 14. Kh5 b5 15. Фd2 Cb7 16. 0-0-0 Лg5 17. Крb1 Лc8 18. Cd4 Лc4 19. Ke2 Фc7 20. b3 Лc5 21. Лf2 Ce7 22. Kef4 b4 23. Kd3 K:d3 24. cd a5 25. Фf4 Ke5 26. C:e5 de 27. Ф:f7+ Крd8 28. Kg7 Л:g7 29. Ф:g7 Лc3 30. d4 Ca6 31. Cf1 C:f1 32. Фg8+ Крd7 33. Лf:f1 Фc6 34. d5 Фb6 35. de+, 1:0.

* * *

Фінішаваў завочны (праз інтэрнэт) шахматны матч зборных Беларусі і Украіны на 33 дошках (кожны ўдзельнік гуляў па дзве партыі). Беларуская каманда перамагла з лікам 34,5:31,5. Па дзве перамогі на сваіх дошках атрымалі мінскія шахматысты В. Астравух, А. Русак і А. Літвіненка, якія былі ўзнагароджаны дыпломамі і прызамі.

А з мінулай восені зборная Беларусі гуляе аналагічны матч супраць Германіі на 50 дошках.

* * *

Скончыўся буйны інтэрнэт-турнір па гульні ў бліц, які праводзіў шахматны сайт chess.com. Сярод 128 удзельнікаў было шмат славутых гросмайстраў, у тым ліку дзеючы чэмпіён свету Магнус Карлсен (Нарвегія). Ён ўпэўнена дайшоў да фіналу, але там нечакана прайграў маладому іранскаму гросмайстру Аліразе Фіруджы — 7,5:8,5.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Фa8! Не вядзе да мэты 1. Фh8? d5! Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

КІНО ДЛЯ СВАІХ

Пакуль нас настойліва заклікаюць заставацца па магчымасці дома, прагляд любімых фільмаў — адзін з бясспрайгрышных варыянтаў, каб бавіць час з карысцю. Калі акцэнтаваць увагу на стужках айчыннай вытворчасці, то ў гэтыя выхадныя беларускія тэлеканалы прапануюць кіно на розныя густы: ваенна-прыгодніцкі баявік «Снайпер: зброя помсты», музычную казку «Прыгоды Бураціна», народную камедыю «Белыя росы» і яе працяг «Белыя росы. Вяртанне».

Ваенная драма «Снайпер: зброя помсты», знятая ў 2009 годзе рэжысёрам Аляксандрам Яфрэмавым, мае інтэрнацыянальны склад акцёраў, сярод якіх Дзмітрый Пяўцоў, Марыя Міронава, Ганна Хітрык, Іван Мацкевіч і іншыя (пільны глядач заўважыць у кадры нават самога рэжысёра). Гісторыя ў карціне пачынаецца з падзей у Сталінградзе ў 1942 годзе. Група савецкіх снайпераў на чале з лейтэнантам Яшыным сутыкаецца з праціўнікам — нямецкім капітанам Карлам Кляйнстам. У гэтым баі гіне дзяўчына з групы савецкіх снайпераў Алеся, а сам Яшын атрымлівае цяжкае раненне... Наступным разам мы сустракаем галоўнага героя пасля заканчэння вайны — на пасадзе каменданта ў невялікім нямецкім мястэчку. Яго памочнік знаходзіць у будынку старой мануфактуры падазроныя чарцяжы, якія, як потым высвятляецца, маюць дачыненне да вядомай нямецкай ракеты «Фау». Разабрацца ў іх трэба вучонаму-ракетчыку з Масквы і яго асістэнтцы. Аднак у хуткім часе высвятляецца, што ў сакрэтнай лабараторыі працуе група Кляйнста. Так Яшыну выпадае магчымасць адпомсціць за сваё загінулае каханне. Чым скончыцца сустрэча зацятых ворагаў, глядзіце ў вячэрнім кінасеансе на «Беларусь 3» 1 мая ў 21.05.

Таксама сацыякультурны канал пакажа ў выхадныя фільм-казку «Прыгоды Бураціна» — дарэчы, савецкія гледачы ўпершыню ўбачылі яе ажно 45 гадоў таму. Мастацкі фільм Леаніда Нячаева, зняты паводле казкі Аляксея Талстога «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна», весела і вонкава лёгка расказвае пра прыгоды драўлянага хлопчыка, які з дапамогай сяброў перамагае зло і змяняецца да лепшага сам. Не прапусціце магчымасць вярнуцца ў дзяцінства 2 мая ў 11.25 на «Беларусь 3».

«Сталічнае тэлебачанне» ў першы дзень мая прапануе гледачам класіку — камедыю «Белыя росы» (1983) рэжысёра Ігара Дабралюбава. Такія фільмы для сучасных гледачоў — нібы падарожжа ў часе, падчас якога можна пранікнуцца атмасферай жыцця вёскі і яе насельнікаў. Карціна, дарэчы, стала ў свой час самай касавай па грашовых зборах (пабіць гэты рэкорд удалося толькі праз шэсць гадоў фільму «Мяне завуць Арлекіна»), а часопіс «Савецкі экран» назваў яе найлепшай камедыяй года. У 2014 годзе выйшаў у пракат працяг фільма — «Белыя росы. Вяртанне» рэжысёра Аляксандры Бутар. Новае вырашэнне дылемы «горад vs вёска» таксама можна будзе ўбачыць на СТБ 1 мая ў 21.00, а паглядзець паўтор кожнай стужкі — у суботу і нядзелю.

Алена ДРАПКО.
Фота www.kino-teatr.ru

1 БЕЛАРУСЬ Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.50 Зона Х. Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.20 Навіны надвор'я.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Па законах ваеннага часу» (12+).
13.05 Меладрама «Жывая вада». 1-я і 2-я серыі (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25 Меладрама «Жывая вада». 3-я і 4-я серыі (16+).
17.05 Беларуская часінка.
21.00 Панарама.
21.50 Зразумелая палітыка.
22.00 «1418 дзён. Гісторыя Перамогі». 1-я серыя (12+).
22.40 Серыял «След» (16+).
0.30 Арэна.
1.10 Дзень спорту.

2 БЕЛАРУСЬ Беларусь 2

7.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.40 Тэлебарометр.
9.05, 20.00 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.20 «Да пабачэння» (16+).
11.05 Хто я? (12+)
11.25 «ЖаннаПажані» (16+).
12.15 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
13.10 Анімацыя «Суперсямейка» (6+).
15.00 Анімацыя «Суперсямейка-2» (12+).
16.50 Трылер «Кантынуум» (12+).
19.15 Суперлато.
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
21.15 «Тата папаў» (16+).
23.05 Ідзі сюды і танцуй.
23.10 «Вячэра не патрэбна» (16+).
23.55 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).

3 БЕЛАРУСЬ Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Страва з куранят з агрэстам.
8.05, 12.00, 20.15 Навіны культуры.
8.25, 12.20, 20.35 «Гэты дзень».
8.30 «Нацыянальны хіт-парад».
9.25, 16.45 «Доказы з мінулага». Дак. цыкл. Уладзімір Маякоўскі (16+).
10.00, 17.25 «Стаўка большая за жыццё». Маст. фільм (12+).
12.25, 21.05 «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
13.20, 21.55 «Жыццё і лёс». Маст. фільм. Фільм першы (12+).
14.50 «Наперад у мінулае».
15.15 «Навукаманія» (6+).
15.45 Канцэрт памяці Алега Молчана «Я нясу вам дар».
19.35 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.00 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
20.40 «Калыханка» (0+).
23.25 «Фарбы памяці». Мастак Эдуард Куфко.

5 БЕЛАРУСЬ Беларусь 5

6.55 Азбука спорту.
7.10 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ — «Нёман».
9.05 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
9.50 Вынікі тыдня.
10.35 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Белшына» — «Дынама-Брэст».
12.30 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Віцебск» — «Славія».
14.25 Піт-стоп.
14.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» — «Ислач».
16.50 Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Юнацтва-Мінск» (Беларусь) — «Лазана» (Швейцарыя).
18.45 Спорт-цэнтр.
18.55 Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга.
21.00 Футбольны ўік-энд.
22.00 Спорт-цэнтр.
22.10 Змешаныя адзінаборствы.

АНТ

6.00, 7.05, 8.05 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.00** Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.10 «Сам-насам з усімі».
12.00 «Модны прыгавор» (6+).
13.10 Меладрама «Я падару табе каханне» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «Пецярбург. Каханне. Да запатрабавання». Серыял (12+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Джульбарс». Серыял (12+).
23.10 «Вялікая Перамога» (16+).
23.45 «Маршал Ракасоўскі. Каханне на лініі агню» (12+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
9.45, 23.50 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Студэнты». Серыял (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.45 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.00 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 20.30 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.25, 16.50 «Знішчальнікі. Апошні бой». Серыял (12+).
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Міншчына».
0.25 «Мінтранс» (16+).
1.10 «Самая карысная праграма» (16+).

МІР

6.00, 10.10, 13.15 Серыял «Маргарыта Назарава» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
14.45, 16.15, 19.15 Серыял «Смерць шпіёнам!» (16+)
22.40, 5.10 Маст. фільм «Жывыя і мёртвыя» (12+).
0.40 Серыял «Далёка ад вайны». 1-4-я серыі (16+).

РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.25 «Па сакрэце ўсяму свету» (12+).
13.00 «У людзях».
13.35 «Плюс-мінус».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Ізмайлаўскі парк». Гумарыстычны канцэрт (16+).
14.50, 17.00 Маст. фільм «Уцякачка» (12+).
18.20 Серыял «Ліквідацыя» (16+).
21.05 Серыял «Чорнае мора» (16+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—Беларусь

